Ogłoszenia parafialne

Pascha 7 Нядзеля

15 maja 2021

на нядзелю 16. 05. 2021.

1. 20-22 мая 2021г. адбываецца малітоўнае чуванне „**Вячэрнік перад**

Урачыстасцю Пяцідзесятніцы”, якое будзе праводзіць кс. Аляксандр Жарнасек MIC

Чацвер, 20 мая 2021 г. (18.00 – 21.00) - Дзень Найсвяцейшай Панны Марыі

Пятніца, 21 мая 2021 г. (18.00 – 21.00) - Адарацыя Крыві Хрыста

Субота, 22 мая 2021 г. (16.00 – 19.00) - Праслаўленне Святога Духа

Малітоўныя інтэнцыі можна скласці у скарбонцы ля ўваходу ў капліцу і можна даслаць на andrzejzby@gmail.com Гэтыя інтэнцыі будуць прачытаны падчас малітвы на ружанцы перад абразом Маці Божай Міласэрнасці.

2. Адказных за парафіяльныя супольнасці запрашаю на сустрэчу пасля святой Імшы у канцэларыю.

3. Маёвыя набажэнствы за паўгадзіны перад св. Імшой.

4. У сераду пасля св. Імшы а 19.00 спатканне для бацькоў дзяцей, якія збіралі наклейкі. Будзем рабіць спіс дзяцей, якія паедуць на аўтобусную паездку і будуць удзельнічаць у „канікулах з Богам”. Прысутнасць абавязковая.

5. 5 чэрвеня адбудзецца адкрыццё Парафіяльнага дома ў вёсцы Пагарцы.

Запрашаем прыняць удзел у святе. Пад час святкавання пройдзе Фестываль талентаў. Удзельнічаць могуць усе, без абмежавання ўзросту. Таленты могуць быць самыя розныя. Запісацца да ўдзелу можна ў арганісткі.

6. Дзякую за складзеныя ахвяры на патрэбы касцёла.

7. **Віцебская Курыя са смуткам паведамляе, што 15 мая 2021г. адышоў па ўзнагароду да Пана святой памяці Часлаў Буткевіч, тата біскупа Віцебскага Алега Буткевіча. Сп. Чаславу было 76 гадоў.**

Вечны адпачынак дай яму, Пане, а святло вечнае няхай яму свеціць. Няхай адпачывае ў супакоі. Амэн.